***Вішнеўскі Аляксей Фёдаравіч,***

***прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь, доктар гістарычных навук, прафесар***

# ПРАВАВЫ СТАТУС САЦЫЯЛЬНЫХ ГРУП НАСЕЛЬНІЦТВА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў XIV – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI СТАГОДДЗЯ

У Вялікім Княстве Літоўскім, у склад якога да сярэдзіны XIV ст. увайшлі ўсе беларускія землі, панаваў феадальны грамадскі лад. Як і ва ўсякім грамадстве феадальнага перыяду, у Беларусі ў адзначаны час існавалі дзве галоўныя сацыяльныя группы насельніцтва: феадалы-землеўладальнікі і феадальна-залежныя сяляне. Акрамя таго, у гарадах і сёлах пражывала значная колькасць людзей, якія лічыліся асабіста свабоднымі. Да гэтай катэгорыі можна аднесці мяшчан, сялян-даннікаў і інш. Феадалы, які займалі пануючае становішча ў эканамічных і прававых адносінах, не ўяўлялі сабой адзінага цэлага і падраздзяляліся на шэраг груп.

У вышэйшую сацыяльную групу ўваходзіла найбольш багатая, прывілеяваная частка феадалаў: князі (нашчадкі знакамітых радоў) і паны. Дакументы адрозніваюць паноў-радных (сябраў вышэйшага органа — Рады) і паноў харугоўных, якія маглі ў час ваенных дзеянняў выставіць вялікую колькасць войска пад сваім сцягам (харугвай). Валодаючы вялікімі зямельнымі плошчамі і значнай колькасцю залежных сялян, гэта група выдзялялася і ў палітычных адносінах — яна займала важнейшыя дзяржаўныя пасады ў ВКЛ. У гістарычнай літаратуры князі і паны вельмі часта сустракаюцца пад тэрмінам “магнаты”. Яны мелі шырокія судовыя паўнамоцтвы і ўласныя ўзброеныя сілы. Некаторыя з іх займалі адначасова

некалькі важных дзяржаўна-адміністрацыйных пасад, хаця гэта забаранялася заканадаўствам.

Акрамя буйных, былі яшчэ сярэднія і дробныя феадалы, якія валодалі невялікімі маёнткамі, меншай колькасцю зямлі і залежных сялян. Калі першыя адыгрывалі значную ролю ў дзяржаўным апараце, то другія з цягам часу маглі разарыцца ў выніку драблення гаспадаркі і перайсці ў больш нізкія сацыяльныя групы. Як сярэднія, так і дробныя феадалы знаходзіліся ў васальнай залежнасці ад князёў і паноў.

У феадальным грамадстве розніца паміж сацыяльнымі групамі (класамі, станамі) выяўлялася ў саслоўным дзяленні і суправаджалася ўстанаўленнем асобнага юрыдычнага месца ў дзяржаве для кожнай з іх. У Беларусі прадстаўнікі феадалаў увайшлі ў прывілеяванае саслоўе (стан) шляхты [1, с.11 – 16].

Трэба заўважыць, што ў саслоўе шляхты ўваходзілі не толькі феадалы, але і прадстаўнікі іншых сацыяльных груп. Напрыклад, сюды былі залічаны многія свабодныя людзі, якія, валодаючы невялікімі зямельнымі надзеламі, вялі сваю гаспадарку ўласнымі сіламі. Некаторыя шляхціцы арандавалі невялікія надзелы зямлі ў буйных феадалаў або знаходзіліся ў іх на службе ў якасці ляснічых, канюшых і г.д. Гэтых асоб нельга аднесці да феадалаў, іх трэба разглядаць як асобную катэгорыю юрыдычна свабодных людзей [5, с.100] .

Шляхецкія саслоўныя правы пераходзілі да нашчадкаў-мужчын ад патомных шляхціцаў, а таксама дачок (але не іх дзецям, калі яны выходзілі замуж не за шляхціца). Жанчына простага стану, выходзячы замуж за шляхціца, станавілася шляхцянкай пажыццёва, нават калі другі ці трэці раз выходзіла замуж за нешляхціца. Шляхецтва можна было атрымаць ад вялікага князя літоўскага, а таксама за мужнасць на полі бою. Шляхецтва

давалася дзіцяці ў сувязі з яго ўсынаўленнем, абвешчаным у судзе шляхціцам (адопцыя) [1, с.12].

Страта шляхецкай годнасці магла наступіць па суду ў сувязі з учыненым злачынствам, а таксама ў тым выпадку, калі шляхціц пачынаў здабываць сабе сродкі для жыцця гандлем або рамяством [5, с.101].

Трэба адзначыць, што пачатак юрыдычнаму афармленню правоў шляхецкага стану (саслоўя) паклалі агульназемскія прывілеі (граматы) 1387, 1413, 1432, 1447 гг. Першапачаткова правы і прывілеі замацоўваліся толькі за шляхтай каталіцкага веравызнання (прывілеі 1387 і 1413 гг.), а затым прывілеем 1432 г. маёмасныя і некаторыя палітычныя правы былі дадзены і праваслаўнай шляхце. Асаблівае значэнне для ўмацавання карпарацыйных палітычных правоў шляхты меў прывілей вялікага князя Аляксандра 1492 г. Гэты нарматыўна-прававы акт можна назваць першай агульнадзяржаўнай хартыяй шляхецкіх вольнасцей. Прывілей даваў шляхецкаму стану такія правы, што з моманту яго выдання сталі непатрэбныя мясцовыя канстытуцыйныя акты. Аляксандр пацвярджае ўсе правы і вольнасці, падараваныя шляхце ранейшымі гасударамі, і дадае больш за 20 пунктаў новых абавязацельстваў з боку вялікага князя. Значная частка гэтых абавязацельстваў абмяжоўвала ўладу вялікага князя на карысць Рады гаспадарскай. Канчаткова правы і прывілеі шляхты былі замацаваны ў Статутах Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг. [4, с.18, 49].

Усе прадстаўнікі шляхты, незалежна ад эканамічнага і палітычнага становішча, мелі агульныя саслоўныя прывілеі: валодаць зямлёй у неабмежаваных памерах на праве ўласнасці; прыцягвацца да адказнасці толькі па суду; займаць пасады ў дзяржаўным апараце і ўдзельнічаць у фарміраванні дзяржаўных і судовых органаў; карыстацца правам асабістай недатыкальнасці і недатыкальнасці маёмасці; былі вызвалены ад падаткаў і

павіннасцей, акрамя выплаты падатку на ваенныя патрэбы і ўдзелу ў шляхецкім апалчэнні (паспалітым рушэнні) і інш. [2, с.32 – 34].

Другім прывілеяваным саслоўем на Беларусі было каталіцкае і праваслаўнае духавенства. Яго вярхушка (мітрапаліты, епіскапы і інш.) па сваім эканамічным становішчы прымыкала да буйных свецкіх феадалаў. Духавенства ўвогуле мела тыя ж прывілеі, што і шляхта, з той розніцай, што саслоўныя прывілеі духавенства не перадаваліся нашчадкам.

Такім чынам, на Беларусі ў разглядаемы перыяд у выніку далейшага развіцця грамадства больш выразна вылучаліся сацыяльныя групы і да сярэдзіны XVI ст. канчаткова аформіліся прывілеяваныя феадальныя станы (саслоўі) — шляхецтва і духавенства.

Можна пагадзіцца з Я.А.Юхо ў тым, што духавенства займала асаблівае становішча ў сацыяльнай структуры грамадства — вярхі яго адносіліся да класа феадалаў, а нізы далучаліся да мяшчан і асабіста свабодных заможных сялян [5, с.101].

Аналізуючы пытанні прававога становішча сялянства, трэба звярнуць увагу на тое, што да канца XVI ст. яно ў ВКЛ было запрыгонена. Першым заканадаўчым актам Вялікага княства Літоўскага, які не толькі сведчыў аб наяўнасці прыгонных, але і юрыдычна пачаў афармляць прыгоннае права, з’яўляецца прывілей 1447 г., адзін з артыкулаў якога забараняў прымаць сялян-уцекачоў. Працэс запрыгоньвання, які распачаўся ў XV ст., больш выразна ўвасобіўся ў Статутах ВКЛ 1529, 1566 гг., а яго завяршэнне адлюстравана ў апошняй рэдакцыі агульнадзяржаўнага заканадаўства ў 1588 годзе.

У разглядаемы перыяд сяляне ВКЛ па эканамічным становішчы і ступені феадальнай залежнасці падзяляліся на тры сацыяльныя групы:

1) гаспадарскіх, якія залежалі непасрэдна ад вялікакняжацкай адміністрацыі і жылі на дзяржаўных землях;

2) панскіх, якія жылі на прыватнаўласніцкіх землях і залежалі ад асобных феадалаў;

3) царкоўных, якія жылі на землях царквы, манастыроў і кляштараў, вышэйшага духавенства і залежалі ад адміністрацыі духоўнага ведамства.

У сваю чаргу гэтыя групы таксама падзяляліся на шэраг катэгорый.

Па маёмасным, а часткова і па прававым становішчы вылучаліся баяры — найбольш заможная вярхушка асабіста вольных сялян, якія выконвалі ваенныя і іншыя павіннасці на карысць дзяржавы ці асобных феадалаў. У залежнасці ад выконваемых абавязкаў баяры падзяляліся на путных і панцырных. Путныя баяры з'яўляліся паштовымі кур'ерамі, што дастаўлялі асабістую і службовую перапіску свайго гаспадара або службовых асоб адміністрацыі. Баяры панцырныя павінны былі ўдзельнічаць у ваенных паходах. Дакументы сведчаць і аб такой катэгорыі баяр, як баяры-слугі. За сваю службу баяры маглі валодаць дзвюма валокамі (прыкладна 42 га) зямлі. Яны не выконвалі паншчыны і акрамя ўласных службовых маглі несці і некаторыя іншыя, больш лёгкія павіннасці. Заканадаўства ВКЛ усе катэгорыі баяр прызнавала асабіста свабоднымі: пры пэўных умовах яны маглі перайсці да іншага феадала.

Другую катэгорыю складалі сяляне-даннікі, якія жылі на гаспадарскіх землях і плацілі феадальную рэнту (даніну) дзяржаве. Памер даніны ад кожнай сялянскай гаспадаркі вызначаўся выбарнай службовай асобай (старцам) і залежаў ад памера даніны, ускладзенай на вёску або воласць у цэлым, і ад колькасці ворнай зямлі ў селяніна. Сабраныя з даннікаў грашовыя і натуральныя падаткі старцы абавязаны былі здаваць мясцовым прадстаўнікам дзяржаўнай адміністрацыі.

У адпаведнасці з праведзенай у 1557 г. аграрнай рэформай у Беларусі вялося стварэнне феадальных фальваркаў. Да апошніх прыпісвалі свабодных сялян-даннікаў. Як вынік, у XVI ст. колькасць сялян-даннікаў рэзка

скарацілася, а за лік іх узрасла колькасць цяглых сялян, што адбывалі паншчыну.

Да трэцяй катэгорыі феадальна-залежных сялян трэба аднесці людзей цяглых, асадных і агароднікаў. Яны мелі меншую колькасць зямлі, а павіннасці ім устанаўліваліся значна большыя.

Асноўнай феадальнай павіннасцю сялян цяглых была паншчына: яны павінны былі два дні ў тыдзень са сваімі прыладамі працы рамантаваць масты, дарогі, замкі і г.д., а таксама плаціць грашовы падатак — сярэбшчыну і некаторыя дробныя падаткі натурай.

Асадныя сяляне былі вызвалены ад паншчыны, аднак плацілі феадалу грашовы чынш. Акрамя таго, ім неабходна было адпрацоўваць 12 дзён талакі ў год, касіць сена, плаціць сярэбшчыну і інш. Сяляне-агароднікі знаходзіліся ў найбольш цяжкім становішчы. Іх надзелы складалі 3 морга зямлі (каля 2 га). Агароднікі мелі права жыць на зямлі як гаспадара, так і феадала. Іх асноўнай павіннасцю была паншчына. Колькасць агароднікаў павялічвалася за лік чэлядзі нявольнай, якую садзілі на зямлю ў сувязі з тым, што з развіццём феадальных адносін узрастала неабходнасць у рабочых руках для працы ў фальварках.

Акрамя ўказаных катэгорый сялян у сёлах пражывалі халупнікі, якія мелі толькі жыллё, і кутнікі, што туліліся па чужых кутках. Адсутнасць сродкаў вытворчасці вымушала іх наймацца на працу да феадалаў, багатых гараджан і сялян або займацца рамяством. Гэтыя сельскія жыхары не мелі зямельных надзелаў і знаходзіліся ў яшчэ больш гаротным становішчы, чым агароднікі. У залежнасці ад наяўнасці права пераходу ад аднаго феадала да другога яны дзяліліся на пахожых (меўшых такое права) і непахожых.

Амаль да канца XVI ст. звычайнай прыналежнасцю панскіх двароў была нявольная чэлядзь, якая з’яўлялася заканадаўча замацаваным

аб’ектам падаравання. Паводле статутаў ВКЛ існавала некалькі прычын ператварэння сялян у нявольную чэлядзь. Нявольнымі лічыліся дзеці, якія нарадзіліся ў законным шлюбе нявольных і вольных. Першапачаткова сяляне гублялі волю ў выніку самапродажу ў няволю, але ў XVI ст. такія здзелкі закон пачаў прызнаваць несапраўднымі. Да сярэдзіны XVI ст. нявольнікамі станавіліся іншы раз і крымінальныя злачынцы, якім пакаранне смерцю са згоды пацярпеўшага замянялася здачай у няволю, але ўжо ў Статуце 1566 г. апошняе палажэнне адсутнічае. На працягу ўсяго разглядаемага перыяду асноўнай прычынай няволі з’яўляўся палон.

У выніку заканадаўчай адмены ўсіх прычын няволі (акрамя палону), а таксама надзялення нявольнай чэлядзі невялікімі зямельнымі ўчасткамі ў XVI ст. большасць яе ператварылася ў прыгонных сялян-агароднікаў.

Такім чынам, збліжэнне сацыяльна-эканамічных статусаў нявольнай чэлядзі і прыгоннага сялянства і запрыгоньванне сялянства паспрыялі таму, што ў асноўным сфарміраваўся адносна адзіны клас — эксплуатуемае і прыгоннае сялянства. Разам з запрыгоньваннем сялянства ішло і заканадаўчае афармленне гэтага працэсу, назіралася ўмацаванне прыгоннага права, гэта значыць фарміраваліся сістэмы юрыдычных нормаў, якія павінны былі абараняць права ўласнасці феадала на прыгонных сялян.

Што тычыцца юрыдычнага статуса прыгонных сялян, то яны не мелі права ўласнасці на зямлю, ім забаранялася набываць маёнткі, без згоды феадала мяняць месца жыхарства і род заняткаў. Акрамя таго, яны не маглі займаць пасады ў дзяржаўным апараце (акрамя некаторых пасад у сельскай адміністрацыі) і былі падсудныя свайму гаспадару. Гонар, жыццё і маёмасць сялян абараняліся крымінальным правам у меншай ступені, чым прадстаўнікоў прывілеяваных саслоўяў.

У XIV — першай палове XVI ст. на Беларусі ішоў інтэнсіўны працэс урбанізацыі грамадства. Калі да 1500 г. у ВКЛ налічвалася 83 гарады, то з

1500 па 1600 г. крыніцы ўтрымліваюць звесткі аб 530 гарадскіх паселішчах. На беларускіх землях у гэты час размяшчалася 387 гарадоў. Большасць з іх былі не надта вялікімі — ад 1,5 да 3 тыс. жыхароў, але вылучаліся і значныя цэнтры з насельніцтвам 10 тыс. чалавек і больш. Такімі ў XVI ст. былі Магілёў, Бярэсце, Віцебск, Менск, Пінск. Насельніцтва беларускіх гарадоў у сваёй асноўнай масе складалі простыя людзі, якія да сярэдзіны XVI ст. утварылі саслоўе мяшчан.

Прававы статус гараджан вызначаўся ўзроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця іх горада. Па маёмасным становішчы насельніцтва гарадоў умоўна можна падзяліць на тры групы: вярхушку (патрыцыят), куды ўваходзілі заможныя купцы і ўладальнікі буйных рамесных майстэрань; сярэднія пласты (слаі) — дробныя гандляры і простыя рамеснікі; гарадскія нізы — вучні майстроў, хатняя прыслуга і інш. У залежнасці ад эканамічнага стану мяшчан знаходзілася і іх прававое становішча, якое вызначалася прыналежнасцю горада (прыватнаўласніцкі, ці вялікакняжацкі); наяўнасцю ў горадзе магдэбургскага права; займаемай пасадай у органах гарадскога самакіравання і г.д. Напрыклад, найбольш заможныя гараджане прывілеяваных вялікакняжацкіх гарадоў (Вільня, Бярэсце, Полацк, Менск) мелі права валодаць маёнткамі па-за межамі горада і павінны былі выконваць вайсковыя абавязкі асабіста або выстаўляць за сябе пэўную колькасць узброеных людзей нароўні з іншымі феадаламі.

Мяшчане гарадоў, якія карысталіся магдэбургскім правам, вызваляліся ад прыгонных работ, падводнай павіннасці, уплаты праязных пошлін (мыта) на ўсёй тэрыторыі ВКЛ і некаторых іншых павіннасцей. Крымінальнае права ўстанаўлівала павышаную адказнасць за іх забойства. Увогуле можна адзначыць, што жыхары гарадоў, якія мелі магдэбургскае права, атрымлівалі шэраг правоў і прывілеяў. Перш за ўсё гэта тычыцца правоў на удзел у фарміраванні органаў гарадскога самакіравання і суда,

на стварэнне рэлігійных брацтваў і аб'яднанне ў цэхі па прафесіях. Адначасова трэба звярнуць увагу на тое, што кіраванне агульнымі справамі ў гарадах, якія карысталіся магдэбургскім правам, знаходзілася, як правіла, у руках заможных гараджан.

Станаўленне мяшчанскага саслоўя не выключала пранікнення ў гарады феадалаў, якія скуплялі ўчасткі зямлі, трымаючы пад сваёй юрысдыкцыяй тых, хто жыў на гэтай частцы гарадской тэрыторыі. У некаторых гарадах шляхта стварала кварталы з вясковых перасяленцаў, якія былі звязаны з панам ланцугамі прыгоннай няволі. На жыхароў так званых юрыдык не распаўсюджвалася адміністрацыйная і судовая ўлада магістрата. Яны не плацілі падаткі, якія ішлі ў бюджэт горада. Процідзеянне юрыдыкам стала адной з галоўных рыс сацыяльнага жыцця горада. Напрыклад, па патрабаванні магістратаў Полацка, Менска, Пінска і другіх гарадоў вярхоўная ўлада выдавала загады, якія абавязвалі ўсіх жыхароў горада, занятых рамяством і гандлем, знаходзіцца пад юрысдыкцыяй магістрата [3, с.160 – 173] .

Меншым комплексам правоў валодалі жыхары гарадоў і мястэчкаў Беларусі, якія не мелі ільготных грамат. Больш таго, яны падлягалі падсуднасці ваявод і старастаў, а не гарадскога магістрата, як гэта было ў прывілеяваных гарадах.

Мяшчане прыватнаўласніцкіх гарадоў і мястэчак знаходзіліся пад уладай феадала, які вызначаў памер грашовых збораў і натуральных павіннасцей. Выконвалі адпрацовачныя павіннасці (паншчына, рамонт насыпаў, ачыстка прудоў, лоўля рыбы і інш.) і тыя мяшчане, якія мелі ворыўныя ўчасткі зямлі, астатнія ж плацілі грашовыя падаткі. Такім чынам, мяшчане прыватнаўласніцкіх гарадоў (Давыд-Гарадок, Нясвіж, Слуцк і інш.) валодалі тым аб'ёмам абавязкаў, правоў і прывілеяў, які ім вызначаў уладальнік горада.

Некаторым прыватнаўласніцкім гарадам таксама было дадзена магдэбургскае права, але з абмежаваннямі на карысць іх уладальнікаў.

Трэба адзначыць і тое, што горад служыў феадалу не толькі ў якасці крыніцы грашовых даходаў, але і як адміністрацыйна-палітычны цэнтр, абарончы апорны пункт.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Грыцкевіч А. Беларуская шляхта / А. Грыцкевіч // Спадчына. –1993. – №1. –С.11 – 16.
2. Вішнеўская І. У. Палітычная і прававая думка Беларусі на мяжы еўрапейскіх цывілізацый (IX – пачатак XXI ст.) / І. У. Вішнеўская. – Мінск : Тэсей, 2008. – 296 с.
3. Копысский З.Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII века / З.Ю. Копысский. – Минск : Наука и техника, 1975. – 191 с.
4. Лойка П.А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. / П.А. Лойка. – Мінск : БДУ, 2002. – 99 с.
5. Юхо Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я.А. Юхо. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – 270 с.